Актуальная гутарка

# Ад квантавай фізікі да Асноўнага Закона і літаратуры

**Гэтыя і іншыя пытанні абмеркавалі спікеры інфармацыйнага дня ў Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. Куляшова старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандр Карлюкевіч і доктар педагагічных навук, палітык і пісьменнік Аляксандр Радзькоў са студэнтамі, а таксама педагагічнымі кадрамі ўстаноў адукацыі Магілёва.**



З МДУ імя А. Куляшова Аляксандр Радзькоў быў звязаны на працягу больш чым 30 гадоў: спачатку вучыўся, потым працаваў, прычым два апошнія гады перад тым, як стаць міністрам адукацыі, у якасці рэктара. Яго кніга «Фізмат» якраз пра той перыяд яго жыцця — сяброў, выкладчыкаў, усіх тых, з кім вучыўся і працаваў на фізмаце ў Магілёўскім педагагічным інстытуце, а потым — Магілёўскім дзяржаўным універсітэце імя А. А. Куляшова. Вядомы беларускі дзеяч і палітык займаў розныя высокія пасады, але ў душы застаўся фізікам. З такога пункту гледжання ён і падзяліўся сваім поглядам на Канстытуцыю і Усебеларускі народны сход.

— Гэта ж таксама аксіяматыка, збор правілаў, якім павінны карыстацца ў жыцці ўсе: пачынаючы ад студэнта і рабочага, заканчваючы прафесарам і міністрам, — падкрэсліў ён. — Грамадства жыве і развіваецца па законах квантавай фізікі. І іх трэба глыбока вывучаць, каб выбраць асноўныя і імі кіравацца. У нас прэзідэнцкая краіна, стаўка робіцца на моцную асобу — лакаматыў, або, кажучы навуковай мовай, навуковага кіраўніка. Ён разумее, што адбываецца, ставіць задачы, дамагаецца іх выканання і ацэньвае далёкую перспектыву. Час патрабуе большага ўдзелу народа ў развіцці краіны, у прыцягненні да кіравання і рэалізацыі намечаных планаў разумных і энергічных людзей з усіх куткоў Беларусі. І гэта арганічна рэалізоўваецца праз Усебеларускі народны сход.

Якія кнігі сёння ў трэндзе, як аўтару прыцягнуць увагу чытача да свайго твора, якія тэмы ўздымаюцца, — гэтыя і іншыя пытанні гучалі ў адрас спікераў сустрэчы. Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, а таксама дырэктар — галоўны рэдактар «Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч распавёў пра дзейнасць і асноўныя кірункі работы грамадскай арганізацыі. Сёння яна аб'ядноўвае звыш 700 чалавек. У іх ліку — шмат таленавітых маладых літаратараў, якіх ведаюць і чытаюць. Тая ж пісьменніца Ганна Чыж-Літаш у сваім тэлеграм-канале мае 11 тысяч падпісчыкаў. Сучасным класікам можна лічыць беларускага пісьменніка, крытыка, публіцыста Алеся Бадака. Яго апошні раман «Ідэальны чытач» — спалучэнне розных жанраў, што ўжо само па сабе захапляе.

Саюз пісьменнікаў робіць стаўку на дзіцячага чытача. Летась у краіне было выдадзена больш чым 9 тысяч кніг і брашур. З іх каля дзвюх тысяч — мастацкай літаратуры, 60—70 працэнтаў якой арыентавана менавіта на дзяцей і падлеткаў. У снежні бягучага года адбудзецца вялікі пленум Саюза пісьменнікаў Беларусі, які будзе прысвечаны дзіцячаму кнігавыдавецтву.

— Вельмі жывая аўдыторыя, абмеркаванне выйшла за рамкі тэмы інфармацыйнага дня, — падзяліўся сваімі ўражаннямі Алесь Карлюкевіч. — Аляксандр Міхайлавіч Радзькоў расказаў пра работу над асноўнымі пастулатамі Канстытуцыі і Усебеларускага народнага сходу. Людзі цікавяцца жывым сацыяльным фарматам — дзе, што адбываецца. І тая цікавасць добра спалучылася з размовай пра работу Саюза пісьменнікаў Беларусі. Кніга — па-ранейшаму выхавальнік і настаўнік грамадства, пра гэта казаў і Аляксандр Радзькоў. Улічваючы, што столькі пытанняў паступіла, цікавасць ёсць і да чытання, і да прасоўвання кнігі. Добра, што ў рамках універсітэта працуе такі плённы творчы актыў.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота Галіны ГАЎРЫЛОВІЧ.**